# Новыя ініцыятывы па ўшанаванні памяці пісьменнікаў-маладнякоўцаў

Трэцяга лютага ў межах рэспубліканскага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыўся навукова-практычны семінар «Ураджэнцы роднага краю». Яго арганізатарамі разам з НББ выступілі Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Выдавецкі дом «Звязда» (газета «Літаратура і мастацтва»), Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры. Семінар быў прысвечаны ўшанаванню памяці пісьменнікаў-маладнякоўцаў на іх малой радзіме, што можна лічыць унёскам праекта ў развіццё літаратурнага краязнаўства.



Алесь Суша і Галіна Скрыган

З прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў звярнуўся намеснік генеральнага дырэктара бібліятэкі Алесь Суша. Здабыткамі праекта, далейшымі планамі падзялілася загадчыца сектара аналітычнай інфармацыі па культуры і мастацтве НББ Тацццяна Лаўрык. Яна прэзентавала новы віртуальны праект, прысвечаны 130-годдзю з дня нараджэння сябра літаб'яднання «Маладняк», пісьменніка і перакладчыка Алеся Гурло (1892 – 1938).


Алесь Гурло




Ганаровым госцем мерапрыемства стала Галіна Скрыган, дачка пісьменніка Яна Скрыгана. Яна падзялілася ўспамінамі пра бацьку, цытавала яго выказванні, што надало асаблівую каштоўнасць выступленню. Расповед пра Яна Скрыгана прадоўжылі госці з Капыльшчыны – дырэктар Каменскага дзіцячага сада – сярэдняй школы Галіна Васілевіч і кіраўніца створанага на яго базе гісторыка-краязнаўчага музея «Бацькаўшчына» Ірына Тагіль. Ірына Іосіфаўна паведаміла пра шэраг ініцыятыў, што ладзяць у гонар пісьменніка яго землякі: «Музей у чамадане», памятны знак у выглядзе літары «С» на Алеі пісьменнікаў у Капылі.

Загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл Бараноўскі распавёў пра значную ролю, якую адыграў Змітрок Бядуля ў багдановічазнаўстве, і першых ініцыятывах па ўшанаванні памяці паэта. Карына Бадылевіч, навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Петруся Броўкі, пазнаёміла з рознымі акцыямі сучаснага фармату, якія ладзіць музей.

Найбольш дакладаў пра сваіх землякоў прадставілі супрацоўнікі розных бібліятэк Беларусі. Ушанаваннем памяці Уладзіміра Дубоўкі актыўна займаецца Пастаўская дзіцячая бібліятэка, якая носіць яго імя. Велапрабегі, квэсты, літаратурна-музычныя спектаклі, інтэрактыўныя карты – гэта толькі невялікі пералік таго, што ладзіцца ў гонар земляка. Пра гэтыя ініцыятывы распавяла бібліятэкар Людміла Сяменас.

Супрацоўнікі Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі і Літаратурнага музея Кузьмы Чорнага, што на Капыльшчыне, штогод арганізуюць мерапрыемствы да дня нараджэння свайго вядомага земляка. Каштоўным досведам і здабыткамі падзялілася загадчыца бібліятэкі Вольга Радкевіч, якая разам з загадчыцай Цімкавіцкага музея Людмілай Ніжэвіч падрыхтавала прэзентацыю.

Сайт мемарыяльнага кабінета Петруся Глебкі, дзе сабраны каштоўныя рукапісы, відэаэкскурсіі, успаміны пра пісьменніка яго дачкі, прадставіў Радзівон Колас, культуролаг аддзела маркетынгавых камунікацый Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

Цягам многіх гадоў у зале беларускай літаратуры НББ да юбілеяў пісьменнікаў-маладнякоўцаў ладзяцца кніжныя выставы, пра якія распавёў Дзмітрый Давідоўскі, вядучы бібліятэкар аддзела абслугоўвання спецыялізаванымі фондамі.

Пра творчасць жанчын – сяброўак літаб'яднання «Маладняк» – і пра выданні анталогіі жаночай беларускай паэзіі слухачы даведаліся з выступлення літаратуразнаўцы, кандыдата філалагічных навук Аксаны Данільчык.

Некаторыя ўдзельнікі семінара не змаглі прысутнічаць на ім, але даслалі інфарматыўныя відэавыступленні. Бібліятэкар аддзела маркетынгу Шклоўскай раённай бібліятэкі Тацццяна Рэентовіч распавяла пра ініцыятывы, што ладзіць установа дзеля ўшанавання памяці Міхася Зарэцкага, параднёнага са Шклоўшчынай, а Аксана Драчан, дырэктар Узденскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса, расказала пра ўнёсак сваіх землякоў і калег у справу ўшанавання памяці паэта.

Каштоўным стала паведамленне Яўгеніі Дзяркач, члена сям'і пісьменніка Міколы Нікановіча, якая падзялілася асабістымі ўспамінамі і фотаздымкамі, у тым ліку і фота з месца пахавання бацькоў пісьменніка, якое сёння патрабуе ўзвядзення помніка.

Семінар прайшоў плённа і вельмі душэўна, бо сабраліся людзі, неабыякавыя да роднай літаратуры, дзякуючы працы якіх спадчына пісьменнікаў-маладнякоўцаў захоўваецца для нашчадкаў і сучаснікаў. Відэазапіс семінара даступны на YouTube (https://www.youtube.com/watch?v=ryLuEW3ByvA).

*Паводле інфармацыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*